Дзяржаўная ўстанова адукацыі
"Рэчыцкая раённая гімназія"

**Я ведаю! Я ганаруся!**

Прайшло шмат гадоў з таго часу, як закончылася Вялікая Айчынная вайна. Гэта была страшэнная вайна. Не ўсім салдатам было суджана вярнуцца дамоў да сваіх родных. Не ўсе засталіся жывымі пасля некалькіх гадоў цяжкіх выпрабаванняў.

Вайна…. Яна закранула кожную сям'ю, прынесла шмат гора і пакут. Тысячы людзей прайшлі праз выпрабаванні вайной, але яны пераадолелі ўсе цяжкасці і перамаглі.

Я не ведаю вайны. Аб ёй я і мае аднагодкі даведаліся з кніг, фільмаў. Аб ёй нам расказваюць ветэраны, якіх застаецца з кожным годам усё менш і менш. На жаль, не засталося нікога з маіх родных франтавікоў, якія гераічна абаранялі Радзіму ў час Вялікай Айчыннай вайны. Але я ведаю пра іх з аповедаў родных.

Я-праўнук ветэранаў. Я вельмі ганаруся гэтым.

Адзін з маіх прадзедаў, Броўка Міхаіл Васільевіч, быў прызваны на вайсковую службу ў 1937 годзе. Ён быў авіямеханікам, удзельнічаў у вызваленні жыхароў Ленінграда. Нашы сямейныя рэліквіі-гэта яго медалі, сярод якіх ёсць медалі "За абарону Ленинграда" "За адвагу", ордэн Чырвонай Зоркі, а таксама пісьмы з фронту. Пасля вайны працаваў інструктарам Брэсцкага абласнога камітэта камуністычнай партыі Беларусі, сакратаром Камуністычнай партыі Беларусі па зоне машынна-трактарнай станцыі ў Кобрынскім раёне. Выхаваў сына і дачку. Яго сын, Броўка Міхаіл Мікалаевіч, мой дзядуля.

Два другія мае прадзеды, Атаманчук Рыгор Яфімавіч і Тарлецкі Віктар Віктаравіч, у гады вайны засталіся без рук. Яны мужна абаранялі нашу Радзіму ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Абодва былі узнагароджаны ордэнамі Славы III ступені, медалямі. Пасля вайны Атаманчук Рыгор Яфімавіч працаваў у калгасе ў весцы Салтанова. Тарлецкі Віктар Віктаравіч працаваў мастаком на ткацкай фабрыцы ў г.Рэчыца.

Яшчэ адзін мой прадзед, Коцур Ісід Іосіфавіч, быў камандзірам разведвальна-дыверсійнага ўзвода партызанскай брыгады імя Щорса,

якая дзейнічала на тэрыторыі Гомельскай вобласці. За ўдзел у баявых дзеяннях узнагароджаны ордэнамі Баявога Чырвонага сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі, ордэнам Айчыннай вайны, медаллю "За адвагу". Пасля вайны працаваў у юрыдычных структурах, а затым старшынёй Рэчыцкага раённага суда.

Брат маёй прабабулі, Пятачэнка Васіль Кузьміч, згарэў у танку. Яму было ўсяго васямнаццаць гадоў. Сваё апошняе прыстанішча ён знайшоў у Польшчы, дзе пахаваны ў брацкай магіле.

Брата майго прадзеда з усёй сям'ёй расстралялі фашысты. Іх імёны, сям'я Броўка, назаўсёды ўвекавечаны на помніку ў парку Перамогі ў нашым горадзе.

Я не ведаю вайны. Я не хачу вайны. Але яе не хацелі і тыя, хто загінуў у час Вялікай Айчыннай вайны. Яны не думалі пра смерць, не думалі аб тым, што не ўбачаць больш ні сонца, ні травы, ні дзяцей, а мужна абаранялі свій край ад ворага.

Я вельмі ганаруся сваімі продкамі, якія ўдзельнічалі ў гэтай вайне.

У мяне калі-небудзь будуць таксама свае дзеці і ўнукі. Я хачу, каб яны з пакалення ў пакаленне перадавалі памяць пра ўдзел нашых родных ў Вялікай Айчыннай вайне. Нашчадкі абавязаны ведаць, якімі намаганнямі дасталіся нам наша свабода, наша шчасце.

А пакуль я кожны год напярэдадні Дня Перамогі еду з бацькамі на могілкі. Я стаўлю кветкі ля падножжа помнікаў маіх прадзедаў як сімвал павагі і ўдзячнасці за мірнае неба, за спакойнае жыццё. Я гляджу на іх фотаздымкі і гавару: "Я памятаю! Я ганаруся! І так будзе заўсёды!"

Падрыхтаваў вучань 11 "А" класа
Атаманчук Ягор Вітальевіч